# ВКЛАД ПОЛЬСКИХ ИССЛЕДОВАТЕЛЬНИЦ В ИСТОРИОГРАФИЮ РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКОЙ ЦЕРКВИ КОНЦА XVIII – НАЧАЛА XX ВВ.

# CONTRIBUTION OF POLISH RESEARCHERS TO THE HISTORIOGRAPHY OF THE ROMAN CATHOLIC CHURCH OF THE LATE XVIII - EARLY XX CENTURIES

Зинаида Антонович,
Минск, Беларусь

Ключевые слова: римско-католическая церковь, польская историография, Католический университет в Люблине Яна Павла II, Варшавский университет.

Резюме. В польской историографии одним из наиболее актуальных направлений является история римско-католической церкви. Женщины-исследовательницы обратились к ней только в середине XX в., тем не менее результаты их работы представляют серьезный вклад в развитие обозначенной проблематики. В Польше среди академических институтов в данной области исследований выделяются Католический университет в Люблине Яна Павла II и Варшавский университет. Их сотрудницы, а также архивисты государственных и конфессиональных архивов привлекают широкую отечественную и зарубежную источниковую базу для исследования социально-политической истории земель Речи Посполитой после ее разделов, развития римско-католической церкви на обозначенных территориях и деятельности представителей духовенства.

Keywords: Roman Catholic Church, Polish historiography, Catholic University of Lublin John Paul II, University of Warsaw.

Summary. One of the most popular trends in Polish historiography is the history of the Roman Catholic Church. Women-researchers turned to it only in the middle of the twentieth century. Nevertheless, the results of their work represent a significant contribution to the development of the indicated problems. Among the polish academic institutes research centers in this field are the Catholic University of John Paul II in Lublin and University of Warsaw. Their employees, as well as archivists of state and confessional archives, draw on a wide domestic and foreign source base to study the socio-political history of the lands of the late XVIII – early XX centuries and the Roman Catholic Church, the activities of the clergy.

Гісторыя рымска-каталіцкай царквы на польскіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. з’яўляецца адной з найбольш цікавых тэматык у польскай гістарыяграфіі, таму што азначаная канфесія адыгрывала значную ролю на грамадска-палітычнай арэне польскіх зямель гэтага перыяду. Аднак даследчыцы па шэрагу аб’ектыўных і суб’ектыўных прычын да гэтай і блізкіх тэм звярнуліся толькі ў сярэдзіне XX ст. Адной з першых была Барбара Грахульская (Barbara Grochulska), якая скончыла Варшаўскі ўніверсітэт і пасля заканчэння Другой сусветнай вайны вярнулася ў alma mater. Асноўнай тэмай яе навуковых інтарэсаў стала Варшаўскае княства. У гэтым кантэксце даследчыца надала ўвагу і рэлігійнаму пытанню, у

прыватнасці, вызначэнню месца рымска-каталіцкай царквы на канфесіянальнай арэне княства. Яна адзначала, што канфесіянальнае кіраўніцтва намагалася замацаваць выключныя пазіцыі царквы ў грамадстве. У гэтай связі Б. Грахульская таксама вылучыла дзве асноўныя праблемы на ўнутрыпалітычнай арэне княства. Крыніцавай базай яе даследаванняў стала перапіска паміж канфесіянальным і свецкім кіраўніцтвам [11].

Вучаніца Б. Грахульскай, Мартына Дэшчынская (Martyna Deszczyńska), таксама звязала свой лёс з Варшаўскім універсітэтам. Яна звярнулася да шырокага кола пытанняў у галіне гісторыі і культуры польскіх зямель XIX ст. У адной з апошніх манаграфій даследчыца сканцэнтравалася на рэлігійным уплыве на польскае адраджэнне канца XVIII – першай трэці XIX ст., закранаючы пытанні талерантнасці і адукацыі [8].

Іншая даследчыца сярэдзіны XX ст. Ганна Дылянгова (Hanna Dylągowa) таксама скончыла Варшаўскі ўніверсітэт, але ўжо з 1950-х гг. працавала ў Каталіцкім універсітэце ў Любліне (з 2005 г. – Каталіцкі ўніверсітэт у Любліне Яна Паўла II). Яна сканцэнтравалася на гісторыі ўніяцкай царквы, а таксама рэгіёнаў, якія ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай адышлі да Расійскай імперыі [16]. У сваёй манаграфіі аўтар адсочвае стаўленне рымска-каталіцкага духавенства да падзей на грамадска-палітычнай арэне польскіх зямель ад падзелаў Рэчы Паспалітай да паўстання 1863–1864 гг. Пры гэтым яна акцэнтуе рэакцыю ніжэйшага кліру і іерархаў царквы на гэтыя падзеі [10].

Аднachасова з Г. Дылянговай ў Каталіцкім універсітэце ў Любліне працавала яшчэ адна выпускніца Варшаўскага ўніверсітэта, якая скончыла дактарантуру ў Вроцлаўскім універсітэце, Ева Яблоньска-Дэптула (Ewa Jabłońska-Deptuła). Яна цікавілася гендэрнай і сямейнай гісторыяй і дзейнасцю манаскіх законаў XIX ст. [21]. Храналагічныя межы яе даследаванняў па гісторыі рымска-каталіцкай царквы таксама супадалі са сферай інтарэсаў Г. Дылянговай [14; 12], а шэраг прац прысвечаны выбітным дзеячам царквы, напрыклад, Эльжбеце Чацкай, якая ў 1908 г. заснавала Таварыства апекі над асобамі, страціўшымі зрок (Towarzystwo Opieki nad Ociemniałymi) [13]. Сёння тэматыку законных аб’яднанняў у сценах ўніверсітэта працягвае Эдыта Хамянтоўская (Edyta Chomentowska) [6 7].

Шматаспектныя даследаванні па гісторыі рымска-каталіцкай царквы працягваюцца ў Каталіцкім універсітэце ў Любліне і на сучасным этапе. Сярод найбольш паслядоўных даследчыц прафесар кафедры гісторыі XIX ст. Ганна Бараньска (Anna Barańska). Яна займаецца праблематыкай канфесіянальнай і гендэрнай гісторыі, паўстанняў 1830-х і 1860-х гг., дыпламатычнымі стасункамі Рыму і Расіі. Крыніцавай базай яе даследаванняў акрамя польскіх выступаюць расійскія і ватыканскія сховішчы. У манаграфіі і шэрагу артыкулаў Г. Бараньска падрабязна разгледзела зносіны паміж урадам Расійскай імперыі і Папам Рымскім, акцэнтуючы выпрацоўку пазіцыі рымска-каталіцкай царквы пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і асабліва заключэнне канкардату 1847 г. [1; 3]. Пры

гэтым шмат увагі даследчыца надае асобам, якія ажыццяўлялі перамовы з боку Рыму [1; 4]. Агляд археаграфічных выданняў аўтарам быў здзейснены ў 2017 годзе [2]. Асобны артыкул цалкам прысвечаны Магілёўскай рымска-каталіцкай архідыяцэзіі [5].

Калегай Г. Бараньскай, у тым ліку і па археаграфічнай дзейнасці, з'яўляецца Эва М. Зюлек (Ewa M. Ziółek), якая пераважна займаецца праблематыкай эпох войнаў Напалеона і княства Варшаўскага, духавенства XIX ст. [17; 23] На кафедры гісторыі XVI–XVIII ст. згаданага ўніверсітэта працуе Аліцыя Пушка (Alicja Puszka), якая цікавіцца пытаннямі адукацыі і выхавання ў XIX–XX ст. У кола яе навуковых інтарэсаў трапіла арганізацыя рэлігійнай адукацыі на розных узроўнях яе атрымання ў навучальных установах Галіцыі [19; 18].

Варшаўскі ўніверсітэт і Каталіцкі ўніверсітэт у Любліне не адзіныя асяродкі даследаванняў азначанай праблематыкі. Сярод іншых на кафедры гісторыі XIX–XX ст. і сучаснай гісторыі Інстытута гісторыі і архівістыкі Універсітэта М. Каперніка ў Торуне працуе Ілона Залеская (Ilona Zaleska). Яна даследуе пераважна ўдзел духавенства ў палітычным жыцці польскіх земляў на мяжы XIX і XX ст. [22].

Гістарычнымі даследаваннямі абмежавана займаюцца манахіні. У ліку нешматлікіх з іх Караліна Ганна Каладзейчык (Karolina Anna Kołodziejczyk), якая ажыццяўляе крыніцазнаўчыя даследаванні [15]. Сярод свецкіх крыніцазнаўцаў гісторыі рымска-каталіцкай царквы Марыя Дэмбоўская (Maria Dębowska), якая прадставіла абагульняючае даследаванне па архівах канфесіянальных устаноў [9], а Агнешка Шмерек (Agnieszka Szmerek) разгледзела інфармацыйн патэнцыял інвентароў піярскага кляштара ў Кракаве [20].

Такім чынам, польскія даследчыцы ў выніку шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў звярнуліся да гісторыі рымска-каталіцкай царквы ў сярэдзіне XX ст. У гэты перыяд цэнтрамі навуковай дзейнасці жанчын-гісторыкаў з'яўляліся акадэмічныя інстытуты, з якіх вылучаюцца Варшаўскі ўніверсітэт (Б. Грахульская, М. Дэшчынская і інш.) і Каталіцкі ўніверсітэт у Любліне (Г. Дылянгова, Э. Яблоньска-Дептула і інш.). Даследчыцы прысвяцілі сваю ўвагу падзеям XIX ст., у прыватнасці, сацыяльна-палітычнай гісторыі Варшаўскага княства. У канцы XX – пачатку XXI ст. пашыраецца сфера навуковых інтарэсаў даследчыц, аб чым сведчыць тэматыка і колькасць выдадзеных прац, з якіх толькі асобныя разгледжаны вышэй. Да крыніцазнаўчага аспекту гэтай праблематыкі звяртаюцца таксама архівісты канфесіянальных і свецкіх архіўных устаноў (М. Дэмбоўская, А. Шмерек і інш.). Шэраг навукоўцаў актуалізуюць агульнапалітычныя і міжнародныя аспекты развіцця каталіцтва ў рэгіёне пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (А. Бараньска, Э.М. Зюлек і інш.), а таксама дзейнасць асобных прадстаўнікоў духавенства на польскіх, беларускіх і украінскіх землях (А. Пушка, І. Залеская і інш.). Тым не менш, асяродкам даследаванняў застаецца Каталіцкі ўніверсітэт у Любліне, дзе створана ўласная навуковая школа. Манаграфіі, артыкулы, археаграфічныя публікацыі рыхтуюцца на

падставе шырокай крыніцавай базы польскіх, ватыканскіх, расійскіх і іншых замежных сховішчаў дакументаў. Аднак матэрыялы, якія захоўваюцца ў беларускіх сховішчах, у работах польскіх даследчыц фігуруюць рэдка. Нягледзячы на гэта, іх працы могуць быць карыснымі пры вывучэнні развіцця рымска-каталіцкай царквы і на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. і выяўленні крыніц па гісторыі Беларусі ў замежных сховішчах.

Літаратура


1. Barańska, A. Dwie wierności. Problem przysiąg biskupów w negocjacjach o konkordat z Rosją (1847) // Z historii ustroju i konstytucjonalizmu Polski. Księga Jubileuszowa dedykowana w 80 rocznicę urodzin Profesora Mariana Kallasa / red. D. Makiłła, M. Wilczek-Karczewska. – Warszawa 2018. – S. 77–87.
2. Barańska, A. Edycje dziewiętnastowiecznych źródeł proweniencji kościelnej lub dotyczących Kościoła katolickiego na ziemiach polskich // Wokół edytorstwa dziewiętnastowiecznych źródeł [red. J. Sikorska-Kulesza]. – Warszawa, 2017. – S. 103–131.
3. Barańska, A. Między Warszawą, Petersburgiem a Rzymem. Kościół a państwo w dobie Królestwa Polskiego (1815–1830). – Lublin: Towarzystwo Naukowe KUL, Lublin 2008. – 910 s.
4. Barańska, A. Nuncjusze wiedeńscy wobec problemów kościelnych i politycznych w zaborze rosyjskim (1801–1863) // Narrata de fontibus hausta. Studia nad problematyką kościelną, polityczną i archiwistyczną ofiarowane Janowi Skarbkowi w 70 rocznicę urodzin, red. A. Barańska, W. Matwiejczyk. – Lublin 2010. – S. 239–268.
5. Barańska, A. Rzymskokatolicka metropolia mohylewska (1798–1917). Struktury i episkopat // „Przegląd Wschodni”. – XIV (2016). – Z. 1(53). – S. 47–96.
6. Chomentowska, E. Bibliografia schematyzmów zakonów męskich z ziem dawnej Rzeczypospolitej z lat 1718–1918. – Lublin: Wydawnictwo KUL, 2016. – 514 s.
7. Chomentowska, E. Schematyzmy zakonów męskich z ziem dawnej Rzeczypospolitej z lat 1718-1918. Studium źródłoznawcze. – Lublin: Wydawnictwo KUL, 2016. – 404 s.
8. Deszczyńska, M. Historia Sacra i Dzieje Narodowe: Refleksja Historyczna Lat 1795-1830 Nad Rolą Religii i Kościoła w Przeszłości Polski. – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe Semper, 2003. – 194 s.
9. Dębowska, M. Archiwa Koscioła katolickiego w ostatnim stuleciu // Nova et vetera. Aktualne problemy achiwów diecezjalnych w Polsce [red. W.W.Żurek]. – Lublin: Wydawnictwo KUL, 2016. – S. 23–43.
10. Dylągowa, H. Duchowieństwo katolickie wobec sprawy narodowej (1764–1864). – Lublin: Wydawnictwo TN KUL, 1981. – 197 s.
11. Grochulska, B. O niektórych aspektach konfliktu Kościoła z rządem Księstwa Warszawskiego // Rocznik Towarzystwa Literackiego imienia Adama Mickiewicza, 1984. – T. XIX. – S. 115–122
12. Jabłońska-Deptuła, E. Kościół, religia, patriotyzm. Polska 1764–1864. – Warszawa: Wydawnictwo Nasze Dziedzictwo, 1985. – 240 s.
13. Jabłońska-Deptuła, E. Matka Elżbieta Czacka i dzieło Lasek. – Lublin: Oficyna Wydawnicza El-Press, 2002. – 390 s.
14. Jabłońska-Deptuła, E., Gawrysiakowa, J. Materiały do zaangażowania patriotycznego zakonów męskich w Królestwie Polskim w latach 1861-1864. – Lublin, 1976. – 513 s.

15. Kołodziejczyk, K.A. Wykaz archiwów zakonnych żenskich i męskich kościoła rzymsko-katolickiego w Polsce // Archiva Ecclesiastica. – Rzeszów, 2014. – S. 81–123.
16. Krzywicka, M. Hanna Dylągowa (1928–2016) – sylwetka i publikacje [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.bu.kul.pl/hanna-dylagowa-1928-2016-sylwetka-i-publikacje,art_69230.html. – Дата доступу: 08.03.2020.
17. Mowa Hieronima Stroynowskiego kanonika kijowskiego o Konstytucji Rządu ustanowionej dnia trzeciego i piątego maja r. 1791 czytana na posiedzeniu publicznym Szkoły Głównej W. X. Lit. dnia pierwszego lipca r. 1791. Do druku przygotowała, wstępem i przypisami opatrzyła Ewa M. Ziółek. – Lublin 2009. – 92 s.
18. Puszka, A. Nauczyciele historii – weterani Powstania Styczniowego i ich wpływ na wychowanie młodzieży w szkołach średnich Galicji okresu autonomii // Archiva temporum testes. – Lublin 2008. – S. 436-452.
19. Puszka, A. Zarys dziejów nauczania historii Kościoła na Uniwersytecie Lwowskim w XIX wieku // Roczniki Humanistyczne. – T. LIV (2006), z. 2. – S. 37–53.
20. Szmerek, A., Dziewiętnastowieczne inwentarze majątkowe jako źródło do poznania dziejów krypty w kościele Przemienienia Pańskiego oo. Pijarów w Krakowie. – Archiva Ecclesiastica. – № 11. – 2018. – S. 99–116.
21. Wasilewski, J.K., Podsiadły, A. Ewa Jabłońska-Deptuła (1931–2008) – sylwetka i publikacje [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.bu.kul.pl/ewa-jablonska-deptula-1931-2008-sylwetka-i-publikacje,art_13558.html. – Дата доступу: 08.03.2020.
22. Zaleska, I. Kościół katolicki a polityka: udział duchowieństwa w życiu politycznym ziem byłego Królestwa Polskiego na przełomie XIX i XX wieku // Rola Kościoła w dziejach Polski : Kościoły w Rzeczypospolitej / red. nauk. Jacek Krochmal. – Warszawa: AGAD, Naczelna Dyrekcja Archiwów Państwowych, 2017. – S. 250-266.
23. Ziółek, E.M. Między tronem i ołtarzem. Kościół i państwo w Księstwie Warszawskim, Lublin; Towarzystwo Naukowe KUL, 2012. – 803 s.